Лысак К.Ф., студ. гр. 211 ФКіСКД
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Майсяйчук С.Б.,
канд. пед. навук, дацэнт

# КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ КАНТЭКСТ ТВОРЧАСЦІ Ф.БАГУШЭВІЧА

На прыканцы XVIII – пачатку XIX стагоддзя, уплыў Вялікай французскай рэвалюцыі, еўрапейскіх нацыянальна-вызваленчых рухаў, развіццё ідэй рамантызму, адным з прынцыпаў якога было вяртанне да мінуўшчыны, якая ўяўлялася як нешта ідэальнае, прыводзіць да асэнсавання многімі народамі патрэбнасці самастойнага грамадска-палітычнага і духоўнага развіцця. Шырокае прызнанне ў асвечаных колах атрымліваюць творы знакамітых еўрапейскіх мысляроў Д. Дзідро, Ж.-Ж. Русо, Вальтэра, М. Ламаносава і інш. Іх погляды і ідэі былі перанесены на беларускую глебу і канкрэтызаваныя ў дачыненні да своеасаблівасцей людзей, якія пражываюць на ёй, уласцівых ім звычаяў, традыцый, менталітэту. Менавіта такое разуменне і прывяло да таго, што на наступных этапах сацыякультурнага развіцця беларускага народа, у другой палове XIX-пачатку XX ст. выспела і аформілася ў якасці духоўнага імператыву беларуская нацыянальная ідэя. Зыходныя элементы гэтай ідэі былі пазначаныя ў творчых працах В. Дуніна - Марцінкевіча, і К. Каліноўскага, Ф. Багушэвіча і А. Пашкевіч, Я. Купалы і Я. Коласа, М. Багдановіча і М. Гарэцкага, А. Луцэвіча і В. Ластоўскага, І. Абдзіраловіч і Я. Лёсіка.

Верагодна, самым значным творцай на ніве беларушчыны другой палове XIX стагоддзя з’яўляецца Францішак Багушэвіч - асновастваральнік сучаснай беларускай літаратуры, літаратурнай мовы, які паўплываў на наступныя пакаленні беларускіх літаратараў, навукоўцаў, мысляроў. Галоўным дасягненнем Багушэвіча з’яўляецца не толькі яго літаратурная спадчына, але таксама выкладзенныя ім культуралагічныя погляды ў дачыненні да беларускага народа, мовы, дзяржавы, якія сталі лёсавызначальнымі для нашай нацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Францішак Багушэвіч ў гісторыі беларускай літаратуры і ў беларускай гісторыі вогуле пазіцыянуецца як “сапраўдны літаратурны майстар”, які “праз усю сваю творчасць пранёс вялікую любоў і шчырую ўвагу да чалавека працы, веры ў яго светлую будучыню”, адлюстраваў у сваёй творчасці “глыбокі сялянскі дэмакратызм і вострае пачуццё нацыянальнай самасвядомасці”, характэрнымі асаблівасцямі якой было “пэўнае адлюстраванне рэчаіснасці, цесная сувязь з грамадска-палітычным, жыццём, дэмакратычная накіраванасць, пільная ўвага да долі простага чалавека – працоўнага селяніна, пратэст супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнечання” [2].

Цантральнае месца ў творчасці Францішка Багушэвіча займае яго праграмны твор - прадмова да зборніка “Дудка беларуская”. Феноменам гэтага твора з’яўляецца тое, што аўтару амаль на трох старонках друкаванага лацінкай тэксту ўдалося змясціць паўнавартасную канцэпцыю беларускай нацыі, ці, прынамсі, закласці трывалы падмурак дзеля наступнага развіцця гэтых ідэй.

Гэтая прадмова вызначыла асноўны накірунак “беларускай думкі” на наступныя дзесяткі год, а пасля заняла свае месца ў свядомасці беларускага народу як аснова яго ментальнасці. “Братцы мілыя, дзеці Зямлі-маткі маей! Вам афяруючы працу сваю, мушу з вамі пагаварыць трохі аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую мы самі, да і не адны мы, а ўсе людзі цёмныя “мужыцкай” завуць, а завецца яна “беларускай” [3, с.87]. Менавіта такімі словамі і пачынаецца знакамітая прадмова. І ў гэтай, здавалася б, простай фразе Францішак Багушэвіч сцвярджае важную ды асноватворную для кожнай нацыі рэч – існаванне мовы. Прычым мовы, якая “ёсць такая ж людская і панская, як і французская, альбо нямецкая, альбо і іншая якая” [3, с.87]. Такім чынам аўтар сцвярджае роўнасць беларускай мовы з іншымі мовамі, што сведчыць аб тым, што Беларусь і беларускі народ займае пэўнае месца ў свеце і адыгрывае роўную з іншымі народамі ролю ў культурным ды гістарычным працэсе. Як сцвярджаюць Я. Д. Грыгаровіч і А.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

І. Смолік ў сваёй працы “Прыкладная культуралогія”. “Мова, з’яўляючыся “праблемай сэнсу культуры”, сінтэзуе сацыяльныя, культурна-гістарычныя, псіхалагічныя, эстэтычныя аспекты жыцця чалавека. Але дзеля таго, каб падзея культуры стала яе з’явай, яна павінна быць пераведзена ў тэкст. Значыць мова ўяўляе ядро сістэмы культуры, менавіта пры дапамозе яе чалавецтва засвойвае каштоўнасці, ацэнкі, уяўленні, усё тое, што вызначае карціну свету. Такім чынам, мова культуры – гэта спосаб захоўвання і перадачы культуры ад пакалення да пакалення” [4, с.30]. Ф. Багушэвіч выразна ўсведамляў, што мова стварае свет, з’яўляецца своеасаблівай “душой народа”, таму і напісаў у сваёй прадмове знакамітае “Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!”

Ф. Багушэвіч вызначае колькасць беларусаў (“нас жа не жменька, а з шэсць мільёнаў”), ды між іншым вызначае межы беларускіх зямель, успрымаючы іх як патэнцыяльнае дзяржаўнае утварэнне: ”Можа, хто спытае: гдзе ж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна гдзе наша мова жывець: яна ад Вільна да Мазыра, ад Вітэбска з малым не ад Чарнігава, гдзе Гродна, Міньск, Магілёў, Вільня і шмат мястэчкаў і вёсак…” [3, с.88].

Аўтар дае сваю тэорыю паходжання назвы “Беларусь” , а разам з ёй сцвярджае адзін з асноватваральных пастулатаў менталітэту беларусаў , які актуальны і да нашага часу: “Спрадвеку, як наша зямелька з Літвой злучылася, як і з Польшай з’ядналася дабравольная, дык усе яе “Беларусяй” звалі, і недарма ж гэта! Не вялікая, не малая, не чырвоная, не чорная яна была, а белыя, чыстая: нікога не біла, не падбівала, толькі баранілася” [3, с.88].

Напрыканцы сваёй знакамітай прадмовы Ф. Багушэвіч дае кароткую гістарычную канцэпцыю беларускай гісторыі, а гісторыя з’яўляецца неад'емнай часткай культуры кожнага народа. Ён сцвярджае, што гісторыя беларускіх зямель шчыльна звязана з Літвой. Ён з’яўляецца прыхільнікам “дамоўнай” тэорыі, па якой беларускія мястэчкі, у прыватнасці –Полацк, прызнавалі панаванне літоўскіх князёў дзеля “супрацоўніцтва” з мэтай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

барацьбы супраць крыжацкай пошасці. Потым князь Гядымін канчаткова далучае беларускія землі да Літвы, якая была “ўдоўжкі аж да Чорнага, ад Дняпра і Днястра ракі да Нёмна; ад Каменьца места аж да Вязьмы – у сярэдзіне Вялікаросіі; ад Дынабурга і за Крамяньчук” [3, с.88], такім чынам, аўтар з’яўляецца прыхыльнікам тэорыі Вялікай Літвы. Аўтар сцвярджае існаванне старажытных традыцый беларускай дзяржаўнасці, а таксам жа ж звяртаецца да “рамантызацыі” гісторыі, ствараючы міф аб слаўнай мінушчыне.

Адпаведна паэтычнаму міфу, які стварыў Ф. Багушэвіч, Беларусь з’яўляецца як краіна гнілых хатак і дурных, як варона, мужыкоў, якія маюцца па астрогах, нараджаюцца ў такі час, што усё жыццё “кепска будзе!”. З прычыны таго, што Францішак Багушэвіч першы як бы абмежаваў поле беларускай літаратурнай думкі, наступныя творцы працавалі менавіта у межах гэтага поля. Справа ў тым, што Багушэвіч у сваёй творчасці пераважна не звяртаўся да “гераічнай мінўшчыны”, не імкнуўся стварыць пазітыўны міф, а імкнуўся адлюстраваць усю боль і пакуты тагачаснага беларускага селяніна. Пачынаючы ад моманта стварэння гэтага “міфу” і да сённяшнега дня, ён чырвонай ніткай праходзіць праз беларускую літаратуру грамадскую і палітычную думку, паспеўшы выйсці з пад кантролю сваіх стваральнікаў, і, шчыльна ўнідрыўшыся ў свядомасць беларусаў, пачаўшы сам вызначаць лёс народу. Трэба адзначыць, што і да і пасля стварэння Багушэвічам свайго міфа, спрабаваліся распрацоўкі іншых бачынняў беларушчыны, такія як ідэя Вялікай Літвы Адама Міцкевіча, альбо ідэя Крывіі Вацлава Ластоўскага. Але падрабязны аналіз і параўнанне гэтых ідэй – прадмет наступных навуковых прац.

Спіс выкарыстанай літаратуры:


1. Акудовіч, В. Код адсутнасці (Асновы беларускай ментальнасці) / В.Акудовіч. – М.: Выд. І.П. Логвінаў, 2008. – 197 с.
2. Багушэвіч, Ф. Творы / Ф. Багушэвіч. – М.: Беларусь, 1967. – 228 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Багушэвіч, Ф. Творы / Ф. Багушэвіч. – М.: Мастацкая літаратура, 2009. –

152 с.

4. Грыгаровіч, Я. Д., Смолік, А.І.. Прыкладная культуралогія: вучэбны дапаможнік / Я. Д. Грыгаровіч, А.І. Смолік. – Мн.: Адукацыя і выхаванне, 2005. – 228 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ